Источник: **«Звязда»** - **2013-01-26**

# Краіна Лімонія

**Ужо зараз у ліманарыі Цэнтральнага батанічнага саду НАН актыўна збіраюць багаты ўраджай, а праз некалькі тыдняў цытрусавыя зацвітуць і напоўняць аранжарэю цудоўным водарам.**

Аранжарэя пладовых цытрусавых раслін з'яўляецца адзінай, унікальнай у Беларусі. Тут сабраны цытрусавыя, якія можна з поспехам вырошчваць ва ўмовах закрытага грунту, кватэрах, офісах не толькі як дэкаратыўныя расліны, але і пладовыя. У калекцыі батанічнага саду сабрана каля 100 гатункаў цытрусавых, 60 гатункаў цытрын, каля 15 гатункаў апельсінаў, мандарыны і грэйпфруты. А таксама даволі рэдкія віды — канканы, цытроны, каламандыны і нават кававае дрэва.



Антон АЛЕХНА (на здымку) — загадчык ліманарыя, навуковы супрацоўнік, куратар калекцый пладовых субтрапічных раслін, ужо больш за дваццаць гадоў займаецца цытрусавымі. З задавальненнем распавядае пра кожнага "гадаванца". Напрыклад, у калекцыі цытрусавых ёсць волат — самы буйны цытрус гатунку "Пандэроза". Антон Іванавіч узгадаў, што ў адзін асабліва ўраджайны год плод завесіў на 1 кг 300 г! Ці,

напрыклад, цытрон "Рука Буды", які сваім знешнім выглядам сапраўды нагадвае складзеныя пальцы.

Саспелыя цытрусавыя трапляюць у лабараторыю на даследаванні, бо на базе ліманарыя распрацоўваюцца тэхналогіі па вырошчванні субтрапічных культур ва ўмовах беларускага клімату. Хто ведае, можа, і настануць такія часы, калі заквітнеюць мандарыны ў нашых садах?

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**